*УДК 378.017:398.3-053.81:001.891:398:378.4(476.2)*
***В. С. Новак, А. А. Кастрыца***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ Ў ГОМЕЛЬСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ: ВЫХАВАННЕ МОЛАДЗІ НА НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

На філалагічным факультэце ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» на працягу многіх гадоў функцыянуе навукова-вучэбная фальклорная лабараторыя, аснову дзейнасці якой складае рэгіянальна-лакальнае вывучэнне фальклору беларусаў.

Палявыя экспедыцыі, калектыўныя (падчас правядзення фальклорнай практыкі) і індывідуальныя (запіс студэнтамі матэрыялаў па месцы жыхарства), сістэмна праведзеныя на тэрыторыі Гомельскай вобласці і іншых рэгіёнаў Беларусі, далі магчымасць сабраць багатыя аўтэнтычныя фальклорна-этнаграфічныя і міфалагічныя матэрыялы.



Малюнак 1 – Экспедыцыя, 2015 г.

Згодна з акрэсленай канцэпцыяй рэгіянальна-лакальнага вывучэння фальклору былі выпрацаваны асноўныя прынцыпы метадалогіі і методыкі даследавання традыцый народнай духоўнай культуры: збор звестак пра абрады, звычаі, песні, прыкметы і павер’і і іншыя жанры, іх камеральная апрацоўка, сістэматызацыя і класіфікацыя, тэксталагічная работа, тэарэтычнае асэнсаванне мясцовай спецыфікі бытавання фальклорных з’яў, выданне зборнікаў, прысвечаных народнай спадчыне асобных раёнаў Гомельскай вобласці і іншых рэгіёнаў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У выніку мэтаскіраванай і карпатлівай шматгадовай працы з’явіліся наступныя кнігі, прысвечаныя народнай духоўнай культуры малой радзімы: «Крыніц кармянскіх переразвоны» (2000), «Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна» (2002), «Вечнае. Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна» (2003), «Спрадвечнай мудрасці скарбонка: сучасны стан традыцыйнай культуры г. Мазыра» (2005), «Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна» (2007), «Лоеўшчына … Бэзавы рай, песенны край. Сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны» (2007), «Народная духоўная культура Брагіншчыны» (2007), «Жаўруковая песня Радзімы. Народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю» (2008), «Зямля чароўная дабра. Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць» (2008), «Святло каштоўнасцей духоўных. Жлобінскі край: мінулае і сучаснае» (2009), «Чачэршчына, нам дадзеная лёсам… Мінулае і сучаснасць Чачэрскага краю» (2010), «Хойнікшчыны спеўная душа. Народная духоўная культура Хойніцкага краю» (2010), «Нясвіжскага краю напеў векавы» (2012), «Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы. Народная духоўная культура Лагойшчыны» (2013), «Жыцця палескага бяздонныя глыбіні. Народная духоўная культура Петрыкаўскага раёна» (2014), «Глыбоччыны духоўнасці глыбіні. Народная духоўная культура Глыбоцкага раёна» (2014), “На берагах Дняпра и Друці: народная духоўная культура Рагачоўскага раёна (2016), “Малой радзімы запаветы продкаў. Народная духоўная культура Жыткавіцкага раёна” (2019), “Зямля ў сонечных далонях. Народная духоўная культура Брагінскага раёна” (2021).

У межах дзейнасці навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі падрыхтаваны таксама да выдання рукапісы зборнікаў па фальклорна-этнаграфічнай спадчыне Нараўлянскага, Ельскага, Лельчыцкага, Светлагорскага, Калінкавіцкага і Акцябрскага раёнаў Гомельскай вобласці.

Варта адзначыць, што студэнты-філолагі прымаюць удзел не толькі ў збіранні фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, але і ў іх тэарэтычным асэнсаванні. На аснове архіўных і ўласна сабраных фальклорных матэрыялаў рыхтуюць паведамленні да ўдзелу ў канферэнцыях, артыкулы для публікацыі ў навуковых зборніках і выданнях, прысвечаных традыцыйнай духоўнай спадчыне малой радзімы. Так, у кнізе “Зямля ў сонечных далонях. Народная духоўная культура Брагінскага раёна” (2021) у якасці асобных артыкулаў прадстаўлены вынікі навуковых даследаванняў студэнтаў-філолагаў А. У Дрывайлы і Т. В. Пімінёнкавай.

За ўвесь перыяд дзейнасці лабараторыі было надрукавана некалькі соцень студэнцкіх артыкулаў, атрыманы студэнцкія гранты Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь для выканання навуковых праектаў (П. М. Цалка, Г. П. Саўчанка, Т. У. Караньковa, В. І. Глузд). У 2022 г. такі грант атрымала студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта Т. В. Пімінёнкава.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ им. Ф. СКОРИНЫ

Вышэйназваныя кнігі, апублікаваныя і рукапісныя, уяўляюць па сутнасці своеасаблівы структураваны электронны фальклорны архіў, матэрыяламі якога карыстаюцца студэнты і выкладчыкі пры напісанні навукова-даследчых работ, пры падрыхтоўцы розных святочных сцэнарыяў і правядзенні фальклорных мерапрыемстваў. Кожны са зборнікаў – гэта адметная энцыклапедыя народнага вопыту і мудрасці беларусаў, увасобленых ў канкрэтных апісаннях абрадаў і звычаяў, знаёмства з якімі далучае нас да вытокаў, генетычнай памяці нашых продкаў. Самі фактычныя матэрыялы, якія складаюць аснову кніг, – каштоўная крыніца непасрэдных ацэнак фальклорных з'яў, дадзеных самімі носьбітамі традыцыйнай культуры. Падчас гутарак са студэнтамі пры выкладанні дысцыплін "Фальклярыстыка", "Славянская міфалогія", "Культуралогія", пры правядзенні сцэнізацый асобных абрадавых з'яў, калі размова вядзецца пра народную духоўную культуру, ёсць падставы ў кожным канкрэтным выпадку падмацаваць тэзіс аб адлюстраванні ў абрадавым фальклоры беларусаў трох культаў (прыродна-касмічнага, культу продкаў, культу працягу роду) мемаратамі інфармантаў – захавальнікаў фальклорна-этнаграфічнай і міфалагічнай спадчыны. Менавіта народнае слова дапамагае данесці да свядомасці студэнтаў глыбіню спаконвечнага народнага філасофскага асэнсавання розных жыццёвых праблем, раскрыць творчы характар мыслення нашых продкаў, прагматычную скіраванасць многіх магічных ахоўных дзеянняў, каб забяспечыць ураджайнасць нівы і сямейны дабрабыт, паэтычнасць светаўспрымання. У гэтым кантэксце важна выхоўваць у моладзі пачуццё гонару за сваю родную народную спадчыну, якая, захоўваючы агульнаэтнічную аснову, вылучаецца багаццем адметных рэгіянальна-лакальных асаблівасцей.

Акрамя актыўнай навукова-даследчай работы, што наладжана ў межах дзейнасці лабараторыі, у студэнтаў ёсць магчымасць далучыцца таксама да мерапрыемстваў, якія носяць характар выхаваўчых і скіраваны на папулярызацыю традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. Формы мерапрыемстваў разнастайныя – ад інтэрактыўных лекцый і экскурсій да канферэнцый па выніках практык і інсцэніровак традыцыйных каляндарных і сямейных абрадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ



Малюнак 2 – Рускі дом, 2021 г.

Варта адзначыць, што з кожным годам і кола зацікаўленых, і колькасць сацыякультурных пляцовак, на якіх выступаюць студэнты, пашыраюцца: да філолагаў далучаюцца студэнты розных факультэтаў – гістарычнага, геолага-геаграфічнага, фізічнага, выступленні ж адбываюцца не толькі ва ўніверсітэце, а яшчэ і у Рускім доме, Гомельскай абласной і Славянскай бібліятэках.

Так, у лютым 2022 г. студэнты 3 курса спецыяльнасці “Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі” пасля знаёмства падчас лекцый па дысцыпліне “Культуралогія” з беларускай культурай, у прыватнасці з фальклорам як унікальным відам мастацтва, наведалі Славянскую бібліятэку, супрацоўнікамі якой быў прапанаваны відэарад фальклорных мерапрыемстваў, праведзеных тут у розныя гады. Кароткія каментарыі, якімі суправаджаўся прагляд народных свят (“Каляды”, “Масленіца”, “Вяселле”, “Вячоркі” і інш.), увасобленых на сцэне самадзейнымі артыстамі ў прыгожым нацыянальным адзенні, з цікавасцю ўспрымаліся студэнтамі, якія з задавальненнем прыгадвалі знаёмую ўжо для іх інфармацыю пра колішнія абрады і звычаі беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ



Малюнак 3 – Славянская бібліятэка, 2022 г.

Як паказвае практыка, працэс навучання не можа абмяжоўвацца гадзінамі, выдзеленымі на вывучэнне той ці іншай дысцыпліны, калі выкладчык ставіць на мэце падрыхтоўку спецыяліста высокага ўзроўню, арыентаванага на максімальную рэалізацыю ў абранай прафесіі. І навучанне, і даследчая дзейнасць, і выхаванне павінны ісці паралельна. Такую магчымасць даюць навукова-даследчыя і навукова-вучэбныя студэнцкія лабараторыі, сярод якіх і навукова-вучэбная фальклорная лабараторыя філалагічнага факультэта, якая паспяхова функцыянуе ўжо шмат год і дае магчымасць асобаснага, творчага і інтэлектуальнага росту не аднаму пакаленню студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ